ВОІНАМ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАМ, ВЕТЭРАНАМ ВАЙНЫ Ў АФГАНІСТАНЕ

Паважаныя таварышы!

15 лютага 2014 года мы адзначаем Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і 25-годдзе з дня выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

Дзесяць далёкіх гадоў удалечыні ад Радзімы нашы ваенна-служачыя выконвалі інтэрнацыянальны абавязак, праяўляючы небывалую мужнасць, самаадданасць і адвагу. Мы заўсёды будзем помніць тых, хто не вярнуўся з пекла баёў.

Афганскі ваенны канфлікт стаў першай вялікай антытэрарыстычнай аперацыяй навейшай гісторыі, спробай спыніць спаўзанне свету ў крывавы хаос.

З гонарам пранёсшы праз гады і выпрабаванні свой баявы сцяг, многія з вас прадаўжаюць дастойна працаваць на карысць Беларусі. Сёння, ва ўмовах новых выклікаў сучаснасці, наша дзяржава высока цэніць ролю воінаў-інтэрнацыяналістаў ва ўмацаванні згоды ў грамадстве, выхаванні падрастаючага пакалення ў духу патрыятызму, стойкасці і самаадданага служэння Айчыне.

Здароўя, шчасця і дабрабыту вам і вашым блізкім.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

УВОДЗІЦЦА ЎТЫЛІЗАЦЫЙНЫ ЗБОР

Утылізацыйны збор адносна транспартных сродкаў уводзіцца ў Беларусі. Адпаведны ўказ № 64 «Аб утылізацыйным зборы адносна транспартных сродкаў» падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Дакумент прыняты ў мэтах забеспячэння рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а таксама максімальнага ўключэння адходаў у грамадзянскі абарот у якасці другаснай сыравіны.

Указ прадугледжвае ўвядзенне ў Беларусі ўтылізацыйнага збору з транспартных сродкаў, вызначэнне плацельшчыкаў збору, парадку яго вылічэння і выплаты. Устанаўліваюцца віды і катэгорыі транспартных сродкаў, адносна якіх будзе выплачвацца ўтылізацыйны збор.

У ліку іншых гэтым зборам будуць абкладацца транспартныя сродкі з электрарухавікамі (за выключэннем аснашчаных гібрыднай сілавой устаноўкай), павышанай праходнасці, самазвалы, прызначаныя для эксплуатацыі ва ўмовах бездарожжа (масай звыш 50 т), і аўтамабілі, увозімыя фізічнымі асобамі для асабістага карыстання незалежна ад аб'ёму рухавіка.

Утылізацыйны збор будзе выплачвацца па базавых стаўках і каэфіцыентах да іх, якія вызначаюцца ўрадам, аднаразова за кожны транспартны сродак. Да такіх транспартных сродкаў адносяцца сродкі, якія выраблены і адчужаюцца на тэрыторыі краіны, у тым ліку прызначаныя для патрэб вытворцы; якія ўвозяцца ў краіну для асабістага карыстання і выпускаюцца ў мэтах абарачэння без абмежаванняў па карыстанні і распараджэнні; якія ўвезены з тэрыторый дзяржаў — членаў Мытнага саюза і падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі. Плацельшчыкамі ўтылізацыйнага збору прызнаюцца юрыдычныя і фізічныя асобы, якія вырабілі і рэалізавалі аўтатранспарт на тэрыторыі краіны; ажыццявілі мытнае дэкларанне транспарту для выпуску ў свабоднае абарачэнне або змяшчэнне пад мытную працэдуру выпуску для ўнутранага спажывання; увезлі ў краіну з тэрыторый дзяржаў — членаў Мытнага саюза транспартныя сродкі для пастаяннага размяшчэння; набылі ва ўласнасць, гаспадарчае веданне або аператыўнае кіраванне транспартныя сродкі, адносна якіх утылізацыйны збор не быў выплачаны. Ад утылізацыйнага збору будуць вызваляцца транспартныя сродкі, увозімыя фізічнымі асобамі, якія прызнаны бежанцамі або атрымалі дазвол на пастаяннае пражыванне ў Беларусі, увозімыя дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі, а таксама выробленыя беларускімі арганізацыямі, што прынялі на сябе абавязацельства забяспечыць бяспечнае абыходжанне з адходамі, што ўтварыліся ў выніку страты транспартнымі сродкамі сваіх спажывецкіх уласцівасцяў.

МУЗЕЙ АЛІМПІЙСКАЙ СЛАВЫ

Адкрыўся ў Магілёве напярэдадні адкрыцця зімовых Алімпійскіх гульняў у Сочы.

Фота БЕЛТА.

Экспазіцыя, прысвечаная алімпійскім чэмпіёнам і прызёрам Магілёўшчыны, размясцілася ў адным з пакояў абласной школы вышэйшага спартыўнага майстэрства. Тут сабраны рарытэтныя медалі, кубкі, памятныя манеты, сувеніры, інвентар, адзенне, фотаздымкі, маркі, друкаваная прадукцыя, звязаная з гісторыяй спартыўных дасягненняў рэгіёну. Удзел у агульнай справе прымалі і ветэраны спорту. Свой унёсак зрабіў паважаны ў Магілёве франтавік, заслужаны трэнер БССР, палкоўнік унутранай службы Мікалай Падшываленка. У горадзе яго ведаюць як чалавека, які шмат зрабіў па аднаўленні спартыўнага жыцця на Магілёўшчыне ў цяжкія пасляваенныя гады. Размовы аб адкрыцці музея вяліся не першы год, але праца па яго стварэнні пачалася толькі летась. Значную дапамогу пры гэтым аказаў аблвыканкам і Магілёўскае прадстаўніцтва НАК краіны.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

СТВОРАНЫ РАБОЧЫЯ ГРУПЫ ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМНЫХ ПЫТАННЯЎ У ЖКГ І АПК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рабочая група павінна выпрацаваць і рэалізаваць канкрэтныя прапановы па вырашэнні праблемных пытанняў і далейшым развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у тым ліку праз падрыхтоўку неабходных праектаў нарматыўных прававых актаў, накіраваных на ўдасканаленне структуры кіравання, сістэмы цэнаўтварэння ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, упарадкаванне фарміравання сабекошту жыллёва-камунальных паслуг, павышэнне якасці прадастаўляемых паслуг, работы з насельніцтвам па месцы жыхарства, эфектыўнасці дзейнасці ЖКГ.

Рабочая група мае права прыцягваць да работы кіраўнікоў і спецыялістаў рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і іншых арганізацый, а таксама іншых асоб, якія маюць адпаведную кваліфікацыю і практычны вопыт.

Вынікі дзейнасці рабочай групы будуць даложаны Прэзідэнту да 31 мая.

Для вырашэння праблемных пытанняў у аграпрамысловым комплексе сфарміравана міжведамасная рабочая група пад кіраўніцтвам прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіла Мясніковіча.

У складзе рабочай групы — 26 чалавек, у тым ліку старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, намеснік кіраўніка спраў Прэзідэнта, старшыні Белстата, Дзяржкаммаёмасці, канцэрна «Белдзяржхарчпрам», мінскіх абласнога і райвыканкама, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання і яго намеснік, намеснікі міністра эканомікі, фінансаў, МУС, па падатках і зборах, генеральныя дырэктары аграрных навукова-практычных цэнтраў НАН Беларусі, прадстаўнікі банкаў, вядомыя кіраўнікі перадавых сельскагаспадарчых арганізацый і іншыя спецыялісты.

Рабочай групе даручаецца выпрацаваць канкрэтныя прапановы па вырашэнні праблемных пытанняў у АПК, перш за ўсё па павышэнні прыбытку і рэнтабельнасці арганізацый сельскай гаспадаркі, зніжэнні запазычанасці і неплацежаздольнасці гаспадарак, сабекошту вытворчасці прадукцыі, у прыватнасці малака і мяса, травяных кармоў, павышэнні эфектыўнасці выкарыстання асноўных сродкаў і іх мадэрнізацыі, развіцці племянной справы і насенняводства, структуры пасеваў з улікам спецыялізацыі і яе абгрунтаванасці, прадукцыйнасці жывёлы, скарачэння расходу кармоў на адзінку вырабленай прадукцыі, па паляпшэнні кадравага забеспячэння сельскагаспадарчых арганізацый.

Да 10 сакавіка Прэзідэнту павінны быць прадстаўлены комплексны даклад аб развіцці аграпрамысловага комплексу і праекты адпаведных нарматыўных прававых актаў.

УСЁ ПРА БАЛЬНІЧНЫЯ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Устаноўлены мінімальны памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці, у тым ліку асобам, за якіх абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да ўзнікнення права на дапамогу.

Як правіла, гэта тычыцца маладых людзей, якія захварэлі ў першыя паўгода працы. Іх выплаты па бальнічным лісце цяпер залежаць не ад заробку, а ад бюджэту пражытачнага мінімуму. За месяц хваробы паложана палова БПМ — цяпер гэта 564.000 рублёў. Памер выплаты па бальнічным лісце вылічваецца наступным чынам: 50% максімальнага памеру БПМ, які дзейнічае ў месяцы, дзе мела месца часовая непрацаздольнасць, дзеляць на колькасць каляндарных дзён у гэтым месяцы, а потым памнажаюць на колькасць каляндарных дзён непрацаздольнасці.

— Змены чакаюць і тых, хто атрымаў траўму ў быце ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення. Раней выплаты за «п'яны» бальнічны складалі 50% ад сумы, якая была паложана за звычайны бальнічны на той жа тэрмін. Цяпер за першыя шэсць дзён такі хворы грошай не атрымае зусім. За другія шэсць дзён аплата будзе праводзіцца ў памеры 40% ад сярэднядзённага заробку. Астатнія дні аплацяць у памеры 50% сярэднядзённага заробку.

Засталося па-ранейшаму

Не закранулі змены памеру выплаты бацькам, якія сышлі на бальнічны праз хваробу дзіцяці. Ім выплацяць 100% сярэднядзённага заробку за перыяд догляду дзіцяці, на які выдадзены бальнічны ліст, у тым ліку за выхадныя. Выдаецца лісток непрацаздольнасці з таго дня, з якога асобе, якая ажыццяўляе догляд, патрабуецца вызваленне ад работы.

Застаўся ранейшым і складае 100% сярэднядзённага заробку за ўвесь перыяд памер выплаты па бальнічным лісце для асоб, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці або іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляе догляд дзіцяці, а таксама па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку яго санаторна-курортнага лячэння. Акрамя таго, уведзена дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку яго медыцынскай рэабілітацыі. Яна таксама аплачваецца ў памеры 100% сярэднядзённага заробку.

❍❍❍

Змены не закранулі і тэрмінаў, на якія прызначаецца бальнічны ліст, незалежна ад таго, будуць гэта выплаты ў сувязі з агульным захворваннем, траўмай у быце або па доглядзе хворага члена сям'і.

Дапамога па часовай непрацаздольнасці ў выпадку захворвання або траўмы ў быце прызначаецца на ўвесь перыяд часовай непрацаздольнасці да дня аднаўлення працаздольнасці або ўстанаўлення інваліднасці, але не больш чым на 120 каляндарных дзён бесперапынна альбо не больш чым на 150 каляндарных дзён з перапынкамі за апошнія 12 месяцаў пры паўторных выпадках часовай непрацаздольнасці ў сувязі з адным альбо роднаснымі захворваннямі або траўмай.

Прызначэнне дапамогі па часовай непрацаздольнасці ў выпадку захворвання або траўмы ў быце можа ажыццяўляцца і на больш працяглыя перыяды на падставе рашэння медыка-рэабілітацыйнай камісіі МРЭК аб працягу лячэння.

Святлана БУСЬКО.

НА ЗАМЕТКУ

Калі работнік звольніўся, але пасля звальнення не працаўладкаваўся афіцыйна, то ён можа разлічваць на тое, што яго бальнічны ліст будзе аплачаны — пры ўмове, што ён звольнены з працы з уважлівай прычыны, захварэў на працягу 30 каляндарных дзён пасля звальнення і хвароба доўжылася больш чым 30 каляндарных дзён. Рашэнне аб прызначэнні дапамогі ў парадку выключэння ў гэтых выпадках прымаецца камісіяй па назначэнні дапамог абласных, Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, а выплачваецца яна па ранейшым месцы працы.

ВАЖНА ВЕДАЦЬ

Не варта блытаць працоўны стаж са стажам страхавым. Цяпер разлік дапамогі па часовай непрацаздольнасці работніку ажыццяўляецца з улікам перыяду выплаты за яго страхавых узносаў. Дапамога асобам, за якіх страхавыя ўзносы выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да ўзнікнення права на яе, назначаецца ў мінімальным памеры. Прасцей кажучы, калі работнік працаваў на «шэрую» кампанію, у якой працадаўца не адлічваў страхавыя ўзносы, то яго страхавы стаж будзе значна меншы за працоўны. Гэта можа негатыўна ўплываць на памер дапамогі ў выпадках часовай непрацаздольнасці.

ПЫТАННЕ-АДКАЗ

Ці аплачваецца бальнічны ліст, калі работнік працуе ў арганізацыі па сумяшчальніцтве?

Калі работнік працуе па асноўным месцы працы і па сумяшчальніцтве, то дапамога прызначаецца па кожным месцы працы. Калі работнік працуе яшчэ і па грамадзянска-прававым дагаворы, то мае права на дапамогу і па месцы выканання работы па гэтым дагаворы. Пры гэтым неабходна адзначыць, што па кожным месцы працы памер дапамогі не можа быць ніжэйшым за мінімальны (50% велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва за кожны поўны месяц часовай непрацаздольнасці).

Ці аплачваецца бальнічны ліст, калі чалавек захварэў падчас адпачынку за свой кошт?

За перыяд хваробы, які супаў з адпачынкам без захавання заработнай платы, дапамога па часовай непрацаздольнасці не назначаецца. Калі работнік працягвае хварэць пасля заканчэння такога водпуску, то дапамога прызначаецца з дня, наступнага за днём заканчэння гэтага водпуску. Але памер дапамогі вызначаецца, зыходзячы з першага дня вызвалення ад працы паводле лістка непрацаздольнасці. Гэта значыць, 12-дзённы перыяд для вылічэння дапамогі ў памеры 80% сярэднядзённага заробку адлічваецца з дня, з якога выдадзены лісток непрацаздольнасці. Такім чынам, калі, напрыклад, водпуск без захавання заработнай платы прадастаўлены з 9 па 17 лютага, а лісток непрацаздольнасці выдадзены з 11 па 26 лютага, то выплата дапамогі па часовай непрацаздольнасці ажыццяўляецца з 18 па 22 лютага ў памеры 80% сярэднядзённага заробку, а пачынаючы з 23 лютага, у памеры 100% сярэднядзённага заробку.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА** (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона

ПО ПРОДАЖЕ СКЛАДА И ГАРАЖА,
принадлежащих УП «ОМЗ «Агротехконмаш» ОАО «Минскоблхлебопродукт» (Продавец)
на праве хозяйственного ведения и расположенных по адресу: Минская обл., г. Заславль, ул. Привокзальная, д. 2.

УП «ОМЗ «Агротехконмаш» ОАО «Минскоблхлебопродукт» для обслуживания здания склада предоставлен земельный участок пл. 0,2163 га (право постоянного пользования) с ограничением прав на земельные участки, находящиеся в водоохранной зоне Заславского водохранилища, площадь 0,2163 га; для обслуживания и эксплуатации здания гаража предоставлен земельный участок пл. 0,0626 га (право постоянного пользования) с ограничением прав на земельные участки, находящиеся в водоохранной зоне Заславского водохранилища, площадь 0,0626 га.
Начальная цена с НДС – 2 211 600 000 бел. руб. Задаток с НДС – 110 580 000 бел. руб.
Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ № 703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества УП «ОМЗ «Агротехконмаш» ОАО «Минскоблхлебопродукт», проводимом 24 февраля 2014 г.
Договор купли-продажи Объекта должен быть заключен в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект производится в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.
Аукцион состоится **24.02.2014 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 20.02.2014 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2. *Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.12.2013.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 193319@mail.ru**

АГУЛЬНАЯ СПАДЧЫНА

Фонд беларускіх бібліятэк папоўніўся ўнікальным факсімільным выданнем А.С. Пушкіна «Болдзінскія рукапісы 1830 года»

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота перадаў у дар кіраўнікам кніжных скарбніц краіны збор твораў вялікага паэта ў трох тамах. Цырымонія ўручэння, закліканая ўмацаваць сяброўскія сувязі народаў, адбылася ўчора ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Фота БЕЛТА.

Рыгор Рапота перадае ў дар збор твораў А.С. Пушкіна ў трох тамах дырэктару Гродзенскай абласной бібліятэкі Лідзіі Мальцавай.

«Народ нам издревле родной...» — пісаў А.С. Пушкін пра беларусаў. Яднанне дзвюх славянскіх нацый пацвярджаецца багатай гісторыяй іх узаемаадносін у галіне культуры, навукі і адукацыі.

Паводле слоў дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы, такога роду падзеі ў культурным жыцці Беларусі і Расіі павінны стаць частай і звычайнай з'явай, паколькі сведчаць аб якасці ўзаемаадносін дзвюх краін. У Саюзнай дзяржаве будуць над гэтым працаваць — галоўнае, каб узнікалі ідэі, запатрабаваныя ў грамадстве.

Рыгор Рапота падкрэсліў, што важнасць культуры ў жыцці дзяржавы нельга недаацэньваць, а людзі не павінны арыентавацца толькі на паўсядзённае быццё і матэрыяльны дабрабыт. «Культура — гэта не толькі ідэйная, але і эканамічная катэгорыя. У тых рэгіёнах, дзе высока ацэньваюцца пытанні культуры, людзям цікавей жыць, адтуль моладзь не з'язджае. Апытанні грамадскай думкі паказваюць, што культурны аспект выходзіць на першы план у параўнанні з многімі іншымі», — распавёў дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы.

Міністр культуры Беларусі Барыс Святлоў адзначыў, што адзіная культурная прастора Саюзнай дзяржавы дынамічна развіваецца дзякуючы абмену нацыянальнымі каштоўнасцямі і дасягненнямі. Перадача ў дар факсімільнага зборніка, выдадзенага сумеснымі намаганнямі міністэрстваў культуры Беларусі і Расіі, — яркае таму пацвярджэнне.

Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі канстатаваў, што цяпер у чытачоў ёсць магчымасць дакрануцца да вытокаў жыцця і творчасці А.С. Пушкіна, зразумець, пра што ён думаў і як ствараў свае шэдэўры.

У знак павагі і прызнання Барыс Святлоў падарыў дзяржсакратару Саюзнай дзяржавы ў сувязі з яго 70-гадовым юбілеем факсімільнае выданне Полацкага Евангелля другой паловы XII стагоддзя.

Урачыстае мерапрыемства адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі невыпадкова, бо яна, на думку Рыгора Рапоты, — цэнтр літаратурнага жыцця беларускай сталіцы.

Марыя ВОЙЦІК.

МАСТАЦТВА КНІГІ — ДЗЕЦЯМ І ДАРОСЛЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Выдавецтва «Кніжны дом» адзначана ў намінацыі «За ўклад у нацыянальнае кнігавыданне» — за выданне высакаякаснай, багата ілюстраванай фундаментальнай даведачнай, навучальнай, навуковай, навукова-папулярнай, дзіцячай і літаратурна-мастацкай літаратуры («Найноўшы філасофскі слоўнік», «Постмадэрнізм», «Гісторыя філасофіі», «Рэлігія», «Псіхалогія», «Фізіятэрапія», «Лекавыя расліны», «Эканоміка», «Рэлігіі свету», серыі «У дапамогу школьніку», «Рэпетытар», «Школьны курс»).

Гэтым разам у рамках «Мастацтва кнігі» было вырашана ўзнагародзіць выданні ў трох спецыяльных намінацыях. Так, у намінацыі «За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны» ўзнагародзілі выдавецтва «Беларусь» за кнігу «Слуцкія паясы. Адраджэнне традыцый» мастацтвазнаўца Барыса Лазукі. Аўтару таксама ўручылі спецыяльны дыплом і памятны знак-сімвал за навуковую даследчую работы ў справе аднаўлення страчаных культурных каштоўнасцяў. Серыя з дванаццаці кніг «Сугучча сэрцаў» выдавецкага дома «Звязда» стала лаўрэатам спецнамінацыі «Садружнасць». А заказныя кнігі «Старонкі гісторыі пажарнай службы Беларусі» і «Жабінкаўскі цукровы завод. 50 гадоў (1963—2013)» (навукова-вытворчая кампанія «Тэхналогія») прызнаны лепшымі ў намінацыі «У люстэрку часу».

За высакаякасны дызайн серый кніг «Маладзік» і «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» спецыяльным дыпломам і памятнымі знакамі-сімваламі ўзнагародзілі Уладзіміра Лукашыка. Аляксандру Суораву адзначылі за творчы падыход да канцэпцыі заказных кніг (выдавецтва «Паліграфіка»), Святлану Лявонцьеву і Галіну Нячаеву — за даследчую працу ў справе захавання старадрукаваных і рукапісных кніг, аднаўленне страчаных каштоўнасцяў.

Найлепшым ілюстратарам (персанальная намінацыя «Майстэрства») прызналі Варвару Калеснікаву за малюнкі да кнігі Настассі Філіпавай «Плюшавыя казкі», а найлепшым дызайнерам — Аляксандра Царова за арыгінальны дызайн навучальных кніг выдавецтва «Аверсэв», а таксама міжвыдавецкай серыі «Школьная бібліятэка», шматтомных збораў твораў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Анатоль Дрыбас прызнаны найлепшым фотамастаком за аўтарскія фотаздымкі альбомаў «Мірскі замак», «Кніжная культура. Ветка», «Полацк 1150» ды іншыя.

Зоя СВЕТЛАЯ.

УПУШЧАНЫЯ ВЫГАДЫ ЕЎРАЗІЙСКАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Нягледзячы на новыя фарматы еўразійскай інтэграцыі (Мытны саюз і Адзіная эканамічная прастора) і імкненне да 1 студзеня 2015 года пабудаваць Еўразійскі эканамічны саюз, у рамках інтэграцыйных працэсаў не дасягнута яшчэ многае, што адыграла б пазітыўную ролю для эканомік краін-удзельніц. І гэта — упушчаныя выгады еўразійскай інтэграцыі.

Пачнем з такой важнай рэчы, як падтрымка стабільнасці нацыянальных валют. Пры ўсіх размовах пра магчымае ўвядзенне адзінай валюты ўсе заўсёды разумелі, што гэта справа дастаткова аддаленай перспектывы з-за мноства няпэўнасцяў, якія трэба будзе растлумачыць, і бар'ераў, якія неабходна ліквідаваць. Вельмі ж далікатнае пытанне — уласная валюта з'яўляецца фундаментам функцыянавання грашова-валютнай сістэмы нацыянальнай дзяржавы. Але, на жаль, не было зроблена нічога і для таго, каб у рамках еўразійскай інтэграцыі надаць дадатковую ўстойлівасць усім тром наяўным нацыянальным валютам.

Возьмем, напрыклад, сістэму ўзаемадапамогі па гэтым аспекце ў краін АСЕАН+3, якая ўжо функцыянуе сёння. Трынаццаць краін, якія знаходзяцца ў значна менш прасунутай стадыі інтэграцыйных працэсаў, ужо чатырнаццаты год развіваюць сістэму ўзаемнай падтрымкі на выпадак валютных праблем у адной з краін у рамках так званай «Ініцыятывы Чыанг Мэй». У выпадку валютных праблем любая з краін-удзельніц можа звярнуцца да запазычанняў са створанага фонду ў 240 мільярдаў долараў ЗША, каб утрымаць курс нацыянальнай валюты на належным узроўні.

Улічым пры гэтым, што ў Кітая, Паўднёвай Карэі і Японіі, якія выступаюць асноўнымі донарамі гэтай ініцыятывы, маюцца вострыя палітычныя супярэчнасці, а ў апошнія месяцы сусветныя эксперты сур'ёзна абмяркоўваюць верагоднасць вайны паміж Кітаем і Японіяй з-за рознагалосся наконт спрэчных астравоў. І ў іх няма такіх інтэграцыйных утварэнняў, як Мытны саюз і Адзіная эканамічная прастора. Затое ёсць разуменне, што валютная стабільнасць у рэгіёне аднолькава выгадная ўсім, бо робіць рэгіянальны рынак працвітаючым і больш прывабным для інвестараў.

Сукупныя міжнародныя актывы Расіі, Беларусі і Казахстана перавышаюць 600 мільярдаў долараў. Пры такім памеры трох эканомік, разам узятых, аналагічны фонд мог бы гарантаваць для патэнцыяльных інвестараў стабільнасць трох нацыянальных валют, павялічваючы прывабнасць усіх трох краін для інвестыцый.

Правобразам можа выступіць Антыкрызісны фонд ЕўрАзЭС, але сума павінна быць сапраўды важкай, на ўзроўні «Ініцыятывы Чыанг Мэй». Можна было б гарантаваць, напрыклад, што інфляцыя кожнай з валют складзе не больш як 4-5 працэнтаў за год, што дазволіла б таксама рэзка знізіць стаўкі ў банках па крэдытах і тым самым даць сур'ёзны штуршок новым ініцыятывам прадпрымальніцкай супольнасці. Дапамагла б гарантаваная стабільнасць валют і развіццю іпатэчных праграм, якія пазітыўна адбіваюцца на развіцці будаўнічага сектара і адчуванні задаволенасці ўмовамі жыцця ў насельніцтва.

Іншая вострая праблема — адсутнасць адзінай прамысловай палітыкі, што дастаткова негатыўна адбіваецца на краінах, якія ўдзельнічаюць у інтэграцыйных працэсах. Нягледзячы на неаднаразовыя прапановы беларускага боку, пакуль што сур'ёзных зрухаў на гэтым шляху няма. Вынікам з'яўляюцца як рознагалоссі паміж «Белкаліем» і «Уралкаліем», якія ўскалыхнулі летась медыйную прастору і з-за якіх Беларусь страціла вельмі значную суму, так і праекты накшталт будаўніцтва ў Расіі канкурэнта для беларускага БелАЗа. Замест аб'яднання намаганняў для сумеснага развіцця прадпрыемстваў прамысловасці, каб з большым поспехам канкурыраваць на сусветных рынках, Расія і Беларусь толькі ўзаемна аслабляюць адна адну з-за падобнай няўзгодненасці.

Да такога ж шэрагу праблем адносіцца і адсутнасць адзінай экспартнай палітыкі. Кожная з краін, што ўдзельнічаюць у еўразійскай інтэграцыі, прыняла заканадаўча ўласную сістэму падтрымкі экспарту, якая не ўлічвае інтарэсы суседніх краін.

Чаму неабходны пераход на наднацыянальны ўзровень ад ужо існуючых канцэпцый і праграм па развіцці экспарту, якія існуюць у Расіі, Беларусі і Казахстане? Па-першае, гэта дапаможа пераадолець уразлівыя месцы ў нацыянальных эканоміках. Вялізная вага ў палітычнай сістэме Расіі алігархаў і кампаній, арыентаваных на экспарт найперш сыравіны, аб'ектыўна перашкаджае развіццю прамысловага патэнцыялу краіны, не кажучы ўжо пра стварэнне ўмоў для росту экспарту тавараў прамысловай групы. Відавочна, што ім выгадней прадаваць сыравіну за мяжу па высокіх цэнах, чым па субсідуемых унутры Расіі, таму кожнае новае прамысловае прадпрыемства, створанае ў Расіі, наносіць ім прамы ўрон. Нядзіўна, што нармальныя для Кітая тэмпы росту прамысловай вытворчасці ў 13—14% за год у папярэднія дзесяцігоддзі ніколі не былі дасягнуты ў Расіі.

Стварэнне адзінай экспартнай праграмы для Еўразійскага эканамічнага саюза зменшыць магчымасці сыравінных лабістаў па блакіраванні развіцця расійскай прамысловасці, бо выведзе гэтыя пытанні на сумесную юрысдыкцыю трох краін. І, дарэчы, вырашыць тую ж праблему і для Казахстана.

А ўцягванне ў працэс развіцця экспарту прамысловых тавараў беларускіх чыноўнікаў і прадпрымальнікаў, якія традыцыйна з'яўляюцца адэптамі росту прамысловасці і экспарту прамысловых тавараў, станоўча паўплывае на праграмы індустрыялізацыі эканомікі Расіі і Казахстана.

Па-другое, такі крок больш цесна звяжа эканомікі трох краін. Асабліва ў гэтым маюць патрэбу Расія і Казахстан, гандаль паміж якімі па аб'ёме амаль у два разы меншы, чым гандаль паміж Расіяй і Беларуссю (пры гэтым улічым, што колькасць насельніцтва Беларусі ў 1,7 раза меншая, чым Казахстана).

Гэта павялічвае дэзынтэграцыйныя рызыкі, паколькі эканомікі, не звязаныя магутнымі эканамічнымі інтарэсамі, менш схільныя да нарошчвання інтэграцыйных працэсаў. Дарэчы, дабіцца ўмацавання эканамічных сувязяў паміж краінамі зоны еўразійскай інтэграцыі можна, выкарыстоўваючы дадатковыя механізмы — аддаючы прыярытэт экспартнай падтрымцы тых тавараў, якія створаны ў кааперацыі з партнёрамі з дзвюх і больш эканомік, што інтэгруюцца.

Па-трэцяе, новая экспартная ініцыятыва выкліча інтарэс іншых краін далучацца да еўразійскай інтэграцыі. Развіццё прамысловасці, асабліва высокатэхналагічных вытворчасцяў, арыентаваных на экспарт, з'яўляецца прынадай для ўсіх постсавецкіх дзяржаў.

Хочацца спадзявацца, што наяўныя ўпушчэнні па названых аспектах еўразійскай інтэграцыі будуць у найбліжэйшыя гады ўлічаны і ліквідаваны.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук.

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
Логойского района Минской области
10 марта 2014 года в 10.00 проводит открытый аукцион
по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома

№ п/п	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь, га	Расходы по подготовке документов	Начальная цена (рублей)	Задаток (рублей)
1	д. Олешники, ул. Веселая, д. 3Б 623287600101000092	0,2000	5 981 948	12 000 000	2 400 000
2	д. Заполье, д. 9А 623287602101000012	0,1500	5 981 948	6 000 000	1 200 000
3	д. Рудня, участок № 2 623287607601000035	0,1582	5 125 700	6 328 000	1 270 600
4	д. Мостище, ул. Центральная, д. 17Б 623287606101000170	0,1517	5 981 948	9 102 000	1 820 400

Задаток перечисляется на р/с № 3600619161107, ЦБУ № 611 филиала № 500, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601 г. Логойска. УНП 600181592, ОКПО 04431636, код платежа 4901, Швабский сельский исполнительный комитет. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельными участками.

Аукцион состоится 10 марта 2014 года в 10.00 по адресу: Минская область, Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 04 марта 2014 года включительно.

Контактные телефоны: 8 (01774) 59 1 35, 59 2 35, 8 (029) 107 16 17.
Наш сайт в интернете: Logoysk.gov.by

17 февраля 2014 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».

Повестка дня:

1. О совершении сделок общества.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Гоздецкого, 28.
Время регистрации в день проведения собрания с 10.00 до 10.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 12.02.2014 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

УНП 200295903 Совет директоров